Журнал Белорусского государственного университета. История. 2022;2:30–39
Journal of the Belarusian State University. History. 2022;2:30–39

*УДК 725.945(476)(091)*

# БОЛЬШЕ НЕ ТАБУ: ЛИБЕРАЛИЗАЦИЯ СЕКСУАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЫ В БССР ПЕРИОДА ХРУЩЕВСКОЙ ОТТЕПЕЛИ

***А. А. ГУЖАЛОВСКИЙ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Представлены результаты анализа основных тенденций развития сексуальной культуры в белорусском обществе периода хрущевской оттепели. На основании изучения архивных материалов и периодики тех лет описывается сексуальное поведение населения БССР, преимущественно молодежи. Отмечено, что сексуальное поведение характеризовалось глубокими изменениями: снижением возраста сексуального дебюта, изменением характера семейно-брачных отношений, ослаблением моральных запретов, размыванием гендерных стереотипов и т. д. Ход этих перемен ускорило приоткрытие железного занавеса, через который проскальзывали идеи и практики сексуальной революции, охватившей вначале США, а затем Европу. Оттепель сопровождалась взрывом общественного интереса к книгам, фильмам, театральным постановкам, посвященным любви, проблемам взаимоотношений мужчины и женщины. Констатируется мысль о том, что вместе с личностным раскрепощением либерализация сексуальной культуры принесла негативные тенденции в виде увеличения числа разводов и абортов, нежелательных беременностей и повышения уровня заболеваемости. Отход от сталинской семейно-брачной модели, в частности от жесткого регулирования репродуктивного поведения населения, зафиксирован в ряде новых нормативных правовых актов, аккумулированных в Кодексе о браке и семье БССР, который был принят Верховным Советом БССР 13 июня 1969 г.

***Ключевые слова:*** сексуальность; брак; развод; семья; молодежь; женщина; любовь.

# БОЛЬШ НЕ ТАБУ: ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯ СЕКСУАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БССР ПЕРЫЯДУ ХРУШЧОЎСКАЙ АДЛІГІ

***А. А. ГУЖАЛОЎСКІ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Прадстаўлены вынікі аналізу асноўных тэндэнцый развіцця сексуальнай культуры ў беларускім грамадстве перыяду хрушчоўскай адлігі. На падставе вывучэння архіўных матэрыялаў і перыёдыкі тых гадоў апісваюцца сексуальныя паводзіны насельніцтва БССР, пераважна моладзі. Адзначаецца, што сексуальныя паводзіны характарызаваліся глыбокімі зменамі: зніжэннем узросту сексуальнага дэбюту, зменай характару сямейна-шлюбных адносін, паслабленнем маральных забарон, размываннем гендарных стэрэатыпаў і г. д. Ход гэтых перамен паскорыла прыадчыненне жалезнай заслоны, праз якую праслізгвалі ідэі і практыкі сексуальнай рэвалюцыі, што ахапіла спачатку ЗША, а потым Еўропу. Адліга суправаджалася выбухам грамадскай цікаўнасці да кніг, фільмаў, тэатральных пастановак, прысвечаных каханню, праблемам узаемаадносін мужчыны і жанчыны. Канстатуецца, што разам з асобасным разняволеннем лібералізацыя сексуальнай культуры прынесла негатыўныя тэндэнцыі ў выглядзе павелічэння колькасці разводаў і абортаў, непажаданых цяжарнасцей і павышэння ўзроўню захворвання. Адыход ад сталінскай сямейна-шлюбнай мадэлі, у прыватнасці ад жорсткага рэгулявання рэпрадуктыўных паводзін насельніцтва, зафіксаваны

**Образец цитирования:**
Гужалоўскі АА. Больш не табу: лібералізацыя сексуальнай культуры ў БССР перыяду хрушчоўскай адлігі. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя*. 2022;2:30–39.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2022-2-30-39

**For citation:**
Huzhalouski AA. No longer taboo: liberalisation of sexual culture in Soviet Belarus during Khrushchev's thaw. *Journal of the Belarusian State University. History*. 2022;2:30–39. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2022-2-30-39

**Автор:**
***Александр Александрович Гужаловский*** – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета.

**Author:**
***Alexander A. Huzhalouski***, doctor of science (history), full professor; professor at the department of ethnology, museology and art history, faculty of history.
*huzhalouski@gmail.com*

ў шэрагу новых нарматыўных прававых актаў, акумуляваных у Кодэксе аб шлюбе і сям'і БССР, якія быў прыняты Вярхоўным Саветам БССР 13 чэрвеня 1969 г.

***Ключавыя словы:*** сексуальнасць; шлюб; развод; сям'я; моладзь; жанчына; каханне.

# NO LONGER TABOO: LIBERALISATION OF SEXUAL CULTURE IN SOVIET BELARUS DURING KHRUSHCHEV'S THAW

***A. A. HUZHALOUSKI***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article presents the results of analysis of the main trends in the development of sexual culture in Belarusian society during the Khrushchev thaw. Based on the study of archival materials and periodicals of the years under investigation, a characteristic of the Soviet Belarus population sexual behaviour, mainly young people, is given. The latter was characterised by profound changes: decrease in the age of sexual debut, change in the nature of family and marriage relations, weakening of moral prohibitions, erosion of gender stereotypes, etc. These changes were accelerated by the opening of the «iron curtain», through which slipped the ideas and practices of the sexual revolution which first swept the United States and then Europe. The thaw was accompanied by an explosion of public interest in books, films, theatrical performances dedicated to love, the problems of relationships between men and women. Along with personal emancipation, the liberalisation of sexual culture brought negative trends in the form of an increase in the number of divorces and abortions, the number of unwanted pregnancies and morbidity. The departure from the Stalinist family and marriage model, strict regulation of the reproductive behaviour of the population in particular, reflected in a number of new legal acts accumulated in the Code on Marriage and Family of the Belarusian SSR adopted by the Supreme Council of the BSSR 1969 June 13.

***Keywords:*** sexuality; marriage; divorce; family; youth; woman; love.

У сталінскую эпоху ўлада свядома і мэтанакіравана выціскала сексуальнасць з грамадскай свядомасці. Адносіны паміж паламі, а таксама мадэлі мужнасці і жаноцкасці ў грамадстве вызначаліся ўладным дыскурсам, дзяржаўнай палітыкай, якая абмяжоўвала магчымыя дзеянні людзей. У 1930-я – пачатку 1950-х гг. у публічнай прасторы практычна адсутнічала інфармацыя пра інтымныя зносіны мужчын і жанчын, сексуальна-шлюбную сферу ў цэлым. Пра яе немагчыма было знайсці згадкі на старонках навуковай, папулярнай ці вучэбнай літаратуры. Калі «небяспечная» тэма ўсё ж уздымалася, гаворка не ішла далей за квазімарксісцкае маралізатарства. Адзін з найбольш аўтарытэтных тагачасных беларускіх псіхолагаў А. П. Ерась папярэджвала чытачоў беларускай маладзёжнай газеты ў 1955 г.: «Нельга палюбіць ворага Радзімы, класавага ворага, няхай яго знешнасць нават класічнай прыгажосці. Чалавека можна палюбіць толькі за духоўнае хараство, а не за прыгожую знешнасць...»[1]

У гэтых умовах вырасла пакаленне савецкіх людзей, у якіх сексуальная цяга выклікала гаму складаных пачуццяў – ад агіды да страху. Яны перадавалі гэтыя пачуцці сваім дзецям, якім было ўласціва суцэльнае сексуальнае невуцтва. Асабліва «заціснутымі» былі гарадскія падлеткі, у адрозненне ад іх вясковых аднагодак, якіх не адукоўвалі, але і не запалохвалі, у той час як ад юных гараджан хавалі абсалютна ўсё. Складаны псіхалагічны стан дзевяцікласніц адной з мінскіх школ перадае наступны фрагмент іх ліста ў часопіс «Работніца і сялянка»: «Ці можна дружыць у школе дзяўчынцы і хлопчыку? І якой павінна быць гэта дружба, дружба савецкіх вучняў, будучых касманаўтаў, адкрывальнікаў новых планет, будучых будаўнікоў камунізму? Многія нашы бацькі забараняюць нам дружыць з хлопчыкамі, а некаторыя таварышы па школе смяюцца»[2].

Сітуацыя пачала павольна змяняцца пасля смерці І. В. Сталіна, калі сацыяльна-палітычная лібералізацыя абумовіла частковае ўзнаўленне прыватнага жыцця савецкіх людзей. Вяртанне прыватнай сферы ў публічны дыскурс паспрыяла змяненню сексуальна-эратычных каштоўнасцей і паводзін. Гэты працэс паскорыла прыадчыненне жалезнай заслоны, праз якую праслізгвалі ідэі і практыкі сексуальнай рэвалюцыі, што ахапіла спачатку ЗША, а потым Еўропу. Паводле слоў Н. Б. Лебінай, у часы адлігі «на змену цяжкавагавай жаноцкасці і гіпербалізаванай мужнасці прыйшлі спартыўная лёгкасць, дзелавітасць і дазаваная сексуальнасць, культ не столькі антыжаноцтва і грубай сілы, колькі інтэлекту і фізічнай дасканаласці, што было ўжо ўласціва заходнім арыенцірам прывабнасці» [1, с. 179].

Пры захаванні афіцыйнага дыскурсу пра святасць шлюбу, шкоднасць мастурбацыі, непрыманне

[1]*Ересь Е. П.* О любви // Сталин. молодежь. 1955. 12 авг. (№ 159). С. 3. (Тут і далей пераклад наш. – *А. Г.*)
[2]*Лур'е Н.* Пра юнацкае каханне і дружбу // Работніца і сялянка. 1962. № 6. С. 23.

гомасексуальнасці хрушчоўская адліга дазволіла публічнае абмеркаванне шэрагу раней табуіраваных тэм, такіх як шлюб па разліку, дашлюбны секс, падлеткавая сексуальнасць і г. д. Адна з першых іх абмеркаванне на старонках беларускага камсамольскага друку распачала заслужаная настаўніца БССР М. М. Пруднікава, якая дэкларавала ў 1954 г.: «Пытанні дружбы, узаемаадносін у калектыве, нарэшце, кахання – гэта пытанні вялікага значэння»[3].

У жніўні 1954 г. Вярхоўны Савет СССР спецыяльным указам адмяніў крымінальную адказнасць у дачыненні да цяжарных жанчын, якія рабілі аборт без медыцынскіх паказанняў. У лістападзе 1955 г. быў легалізаваны штучны выкідак, зроблены ў шпітальных умовах па просьбе цяжарнай. Гэта рашэнне тлумачылася жаданнем даць жанчыне магчымасць самой вырашаць пытанне аб уласным мацярынстве, а таксама зменшыць шкоду яе здароўю ад пазашпітальных абортаў. Сексуальная непісьменнасць і нізкі ўзровень жыцця насельніцтва адразу ж абумовілі рэзкае павелічэнне афіцыйных паказчыкаў штучнага спынення цяжарнасці. Паводле даных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення СССР, у 1955 г. у краіне былі зроблены 2 671 000 легальных абортаў, у 1956 г. – 4 609 000, у 1957 г. – 5 158 000, у 1958 г. – 5 927 000 абортаў. У 1958 г. на 100 нараджэнняў у СССР былі зроблены 112 зарэгістраваных абортаў[4]. Маладыя жанчыны, якія пад ціскам розных абставін па-ранейшаму былі вымушаны падпольна пазбаўляцца ад цяжарнасці, цяпер падлягалі грамадскаму асуджэнню[5]. Тыя, хто ішоў на забойства ўласнага немаўляці, прыцягваліся да крымінальнай адказнасці[6].

Змены ў сексуальнасці беларускіх жанчын часоў адлігі дэманстраваў часопіс «Работніца і сялянка», на старонках якога пачалося абмеркаванне раней забароненых тэм. У 1954 г. на яго апошняй старонцы побач з рэцэптамі гатавання шніцаля, шашлыка і бісквітнага пячэння з'явіліся выявы модных туалетаў. Навінкай 1955 г. была публікацыя прымітыўных касметычных парад[7], якія з кожным годам набывалі ўсё больш прафесійны характар[8]. Неўзабаве пасля ХХ з'езда КПСС часопіс распачаў абмеркаванне невычэрпнай тэмы, а менавіта тэмы непадзеленага кахання. Быў надрукаваны ліст чытачкі Н., якая перажывала фрустрацыю з нагоды страты пачуццяў да інтэлектуальна ніжэйшага за яе мужа[9]. З таго часу лісты страціўшых альбо пазбаўленых кахання жанчын з'яўляліся амаль у кожным нумары часопіса «Работніца і сялянка», рэдакцыя якога звычайна прапаноўвала чытачкам субліміраваць пачуццё ў працу, грамадскае жыццё ці творчасць.

Легітымізацыя штучнага перапынення цяжарнасці не магла не паставіць пытанне аб сродках засцярогі як пра альтэрнатыву аборту. Арсенал сродкаў засцярогі ў другой палове 1950-х – 1960-я гг. значна пашырыўся. Урачы раілі жанчынам рабіць спрынцаванне, а таксама выкарыстоўваць таблеткі «Нікацэпцін», шыйныя каўпачкі, у горшым выпадку лусту лімона. Мужчынам рэкамендавалі карыстацца прэзерватывамі, якія перад ужываннем неабходна было праверыць, «злёгку расцягнуўшы і надзьмуўшы»[10].

Педагагізацыя і медыкалізацыя сексуальнасці (у тэрміналогіі М. Фуко [2, с. 204–206]), што адбываліся ў беларускім медыйным полі, не маглі замяніць сур'ёзную сексалагічную літаратуру, якой відавочна не хапала. Сітуацыя змянілася да лепшага ў 1960 г., калі ў маскоўскім медыцынскім выдавецтве выйшаў пераклад кнігі ўсходнегерманскага ўрача Р. Нойберта «Пытанні полу». Толькі ад азнаямлення са зместам гэтай кнігі ў беларускага чытача перахоплівала дыханне: у ёй былі раздзелы пад назвамі «Аб ласках», «Палавыя зносіны», «Папярэджванне цяжарнасці» і нават «Палавыя вычвары» [3, с. 87]. Нешматлікія экзэмпляры выдання, якія дайшлі да Беларусі, былі вельмі хутка зачытаны да дзірак, на іх старонках з'явіліся шматлікія пазнакі і каментарыі.

Адліга суправаджалася выбухам грамадскай цікаўнасці да кніг, фільмаў, тэатральных пастановак, прысвечаных каханню, праблемам узаемаадносін мужчыны і жанчыны. Першыя спробы беларускіх пісьменнікаў даследаваць фізіялагічны бок кахання ў 1950-я гг. былі не надта ўдалыя. Нават сцэна гарачых пацалункаў трактарыста Грамыкі і агранома Галі, якімі вырашаўся вытворчы канфлікт у апавяданні Р. К. Сабаленкі «Пад старой дзічкай», выклікала абурэнне крытыкі[11]. Тэму інтымных адносін паміж мужчынам і жанчынай спачатку ў апавяданнях[12], а потым у рамане[13] здолеў вярнуць у беларускую літаратуру І. П. Мележ. Рэабілітацыі гэтай

[3]*Пруднікава М. М.* Вучыце юнакоў і дзяўчат дружыць // Чырв. змена. 1954. 31 студз. (№ 21). С. 3.
[4]Нац. арх. Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 519. Арк. 20.
[5]*Карэлін А.* Гісторыя аднаго «ЧП» // Чырв. змена. 1965. 6 чэрв. (№ 111). С. 2.
[6]*Гебелева С.* Распіска ў подласці // Чырв. змена. 1965. 4 крас. (№ 66). С. 2.
[7]*Цімафеева В. А.* Вугрыстая высыпка // Работніца і сялянка. 1955. № 3. С. 24.
[8]Як пазбавіцца лішніх валасоў // Работніца і сялянка. 1956. № 6. С. 24 ; Як пазбавіцца мазалёў // Работніца і сялянка. 1956. № 9. С. 25.
[9]Чаму так здарылася? // Работніца і сялянка. 1957. № 1. С. 7.
[10]*Камінская В. Т.* Ці можна засцерагчыся ад цяжарнасці // Работніца і сялянка. 1963. № 4. С. 24.
[11]*Модель Ф.* Рассказы о любви и дружбе // Сталин. молодежь. 1955. 16 дек. (№ 247). С. 3.
[12]*Мележ І.* Спатканне за горадам // Работніца і сялянка. 1956. № 10. С. 18–22.
[13]*Мележ І.* Людзі на балоце. Мінск : Дзяржвыдат БССР, 1962. С. 112.

тэмы паспрыяла таксама рамантычная аповесць У. С. Караткевіча «Чазенія»[14]. Студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Я. У. Янішчыц у 1967 г. надрукавала верш «Непрыручаная птушка», дзе былі такія радкі: *Каторы дзень настрой губляю / І зноў па-новаму люблю. / Бягу, гукаю, выглядаю, / Шукаю, думаю, не сплю*[15].

На працягу 1965 г. у беларускіх кінатэатрах амаль штодня адбываліся аншлагі на сеансах, дзе дэманстравалася меладрама В. дэ Сіка «Шлюб па-італьянскі», галоўная гераіня якой мела траіх дзетак ад розных бацькоў. У тым жа годзе на беларускія экраны выйшаў фільм «Любімая» вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм». Па-наватарску распаведзеная маладым рэжысёрам Р. Н. Віктаравым гісторыя кахання ўчарашняй дзесяцікласніцы і маладога будаўніка адразу выклікала абвінавачванні ў апашленні пачуццяў, пагоні за эфектнымі ракурсамі, скажэнні сацыялістычнай рэчаіснасці[16]. У 1966 г. у спектаклі «Выклік багам» Б. У. Эрына гледачы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ўпершыню ўбачылі на сцэне актрыс у купальніках[17].

Падчас падрыхтоўкі кампаніі па барацьбе з дармаедамі ў 1961–1965 гг. шырокая беларуская грамадскасць даведалася пра тое, што праваахоўныя органы і крымінальны свет добра ведалі і раней: у рэспубліцы існуе падпольная прастытуцыя. Пакуль што назваць найстаражытнейшую прафесію ўслых журналісты не рашаліся, затое не шкадавалі выключна негатыўных фарбаў для апісання яе прадстаўніц: «На адной з вуліц Мінска знайшла прытулак нейкая Зінаіда Зайкоўская. Гэтая асоба, якой споўнілася больш за 35 гадоў, моцная і здаровая, не жадае працаваць. Яна жыве з таго, што заманьвае да сябе мужчын, маючых у кішэнях грошы. Дзіўна, што суседзі цярпяць гэтую асобу!»[18] Неўзабаве адзін з карэспандэнтаў газеты «Чырвоная змена» згадаў у сваім допісу з Баранавіч «дзяўчыну лёгкіх паводзін Н. Іванову», якую мясцовыя дружыннікі, разгубленыя ад яе нагласці, адпусцілі без пакарання[19]. У 1964 г. пракурор Мінска І. А. Камароў скардзіўся ў ЦК КПБ, што «…такія ганебныя з’явы, як зводніцтва, распуста, утрыманне прытонаў у кватэрах, прадстаўлены далёка не адзінкавымі фактамі ў беларускай сталіцы. Аднак барацьба з гэтым злом вядзецца ўсё яшчэ слаба. Дрэнна пастаўлена работа па папярэджванні і своечасовым выяўленні прытонаў, міліцыя з гэтай мэтай слаба прыцягвае грамадскасць»[20].

Першыя сціплыя крокі ў бок лібералізацыі грамадскага жыцця, у прыватнасці рэалізацыя пастановы Савета Міністраў СССР аб сумесным навучанні хлопчыкаў і дзяўчынак пачынаючы з 1954/55 навучальнага года[21], паказалі, што паводзіны савецкай моладзі значна адрозніваюцца ад афіцыйных уяўленняў і развіваюцца ў адным накірунку з паводзінамі іх равеснікаў за мяжой. У адрозненне ад «маўклівага» пакалення сваіх бацькоў, моладзь другой паловы 1950-х – першай паловы 1960-х гг. пачала больш адкрыта выказваць думкі, звязаныя з інтымнай сферай жыцця. «Цяпер модна круціць любоў з усімі… Круці, пакуль круціцца», – так маладая віцяблянка апісвала норавы ў сваім горадзе ў 1965 г.[22]

Пра адыход на перыферыю пурытанскай сталінскай мадэлі сексуальных паводзін адразу пасля прыбыцця ў Мінск даведаўся 21-гадовы Лі Харві Освальд. Запісы ў яго дзённіку сведчаць аб тым, што да шлюбу з Марынай Прусаковай ён не меў недахопу ў сексуальных стасунках з беларускімі дзяўчатамі: «Іна… [прозвішча напісана неразборліва]. Бландзінка, вучыцца ў кансерваторыі, з Рыгі. Я сустрэўся з ёй у 1960-м у Зігераў, яе сям’я (якая паслала яе ў Мінск), відавочна, заможная. Іне падабаецца моднае адзенне, добры абутак і бялізна. У кастрычніку 1960 г. мы сталі вельмі блізкімі адзін аднаму, што скончылася палавым актам 21 кастрычніка. Яна была нявінніца, мы сустракаліся такім чынам 4 ці 5 разоў, апошні – 4 лістапада 1960 г. Пасля заканчэння Мінскай кансерваторыі яна з’ехала з Мінска ў Рыгу»[23].

У гэтай сітуацыі да выхавання пачуццяў далучыўся беларускі маладзёжны друк, які ў большай ступені імкнуўся ўтаймаваць, паставіць пад кантроль, чым зразумець і асэнсаваць, сексуальныя памкненні сваіх чытачоў. У 1956 г. забытую з 1920-х гг. практыку правядзення публічных дыскусій, прысвечаных каханню, узнавіла рэдакцыя часопіса «Маладосць»[24]. Наступная падобная дыскусія, яшчэ больш шырокая, у якой удзельнічалі больш за 100 юнакоў і дзяўчат, адбылася ў 1959 г. на старонках газеты «Чырвоная змена»[25]. А з 1966 г. праблемы сексуальна-шлюбных

[14] *Караткевіч У.* Чазенія // Маладосць. 1967. № 3. С. 70.
[15] *Янішчыц Ж.* Непрыручаная птушка // Дзень паэзіі / уклад. Х. Жычка. Мінск, 1967. С. 91.
[16] *Крупеня Е.* Вопрос о счастье поставлен… // Знамя юности. 1965. 6 окт. (№ 199). С. 4 ; НАРБ. Ф. 4п. Воп. 116. Спр. 3. Арк. 193.
[17] *Делендик А.* Иронические мемуары. Минск, 2015. С. 66.
[18] *Плешавеня В.* Дармаедам не месца ў нашым жыцці // ЛіМ. 1960. 30 верас. (№ 79). С. 4.
[19] *Падбярозны А.* Гэта ганьбіць горад // Чырв. змена. 1961. 20 ліп. (№ 142). С. 3.
[20] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 638. Арк. 149.
[21] *Кухараў С.* У школах сталіцы перад сумесным навучаннем // Настаўн. газ. 1954. 12 жн. (№ 32). С. 3.
[22] Какие они – Ромео и Джульетта XX века? // Знамя юности. 1965. 21 нояб. (№ 231). С. 2.
[23] Photocopy of pages from the diary of Lee Harvey Oswald, in which he discusses his time spent in the USSR // The Portal to Texas History [Electronic resource]. URL: https://texashistory.unt.edu/ark:/67531/metapth339322/m1/57/ (date of access: 01.03.2022).
[24] Што вы параіце? // Маладосць. 1956. № 2. С. 20 ; Там жа. № 4. С. 17 ; Там жа. № 5. С. 17 ; Там жа. № 6. С. 21 ; Там жа. № 7. С. 16.
[25] *Асіпенка А.* Пра каханне, вернасць і здраду // Чырв. змена. 1959. 6 жн. (№ 153). С. 3.

адносін рэгулярна абмяркоўваліся з актыўным удзелам школьнікаў у рубрыцы «Любоў ды лад» у газеце «Знамя юности»[26].

Лісты ўдзельнікаў дыскусій прыадчынялі заслону над найбольш нябачным сегментам паўсядзённага жыцця жыхароў БССР. Паэтка Е. Я. Лось распавядала чытачам газеты «Звязда» пра лёс беларускай вясковай дзяўчыны, які, на жаль, не быў унікальным для таго часу: «У пошуках лёгкай долі вырашыла паехаць у новыя мясціны, але не ўпрацавала там, збегла. Вярнуўшыся ж у Мінск, пачала галоўным чынам “гуляць” кожны вечар з новым знаёмым, а то і з проста сустрэтым на вуліцы… Ці можна так марнаваць маладосць? Не!»[27]

Дыскусіі «пра гэта» ішлі не толькі на старонках перыядычных выданняў, але і ў непасрэдных зносінах на адукацыйных, клубных і іншых пляцоўках. Адна з першых падобных дыскусій распачала 1957/58 навучальны год у Пінску, дзе па ініцыятыве мясцовага камсамола адбылася вечарына кахання і кветак. Яе ўдзельнікі танцавалі, дэкламавалі вершы, а таксама ўдзельнічалі ў дыспуце, куды «ханжам уваход быў забаронены»[28]. Папулярнасць публічнага абмеркавання пытанняў кахання ў моладзевым асяродку хутка расла і дасягнула піка ў сярэдзіне 1960-х гг. Такая масавізацыя мела адваротны бок у выглядзе прымітывізацыі праблем, што абмяркоўваліся. Гэта было заўважана педагогамі-наватарамі: «Мы захапіліся шырокавяшчальнымі спрэчкамі і лекцыямі на гэтую тэму, часам бесцырымонна аналізуем пачуцці і адносіны маладых людзей, якія сядзяць тут жа ў зале. Ці не таму ў некаторых з іх складваецца ўяўленне, што аб самых патаемных чалавечых перажываннях можна казаць на шматлюдных сходах? На словах – услаўленне кахання, на справе – выхаванне непавагі да яго»[29].

Сексуальныя паводзіны і каштоўнасці моладзі імкліва змяняліся, але рэтраграды, якія кіравалі сферай адукацыі, рабілі выгляд, што нічога не адбываецца. Заклікі вучоных тэрмінова распачынаць палавое выхаванне падлеткаў на ўзор варшаўскай дашлюбнай і сямейнай кансультацыі ігнараваліся [4, с. 201]. Сведчанні глыбокіх, доўгатэрміновых і незваротных перамен трактаваліся як справакаваныя шкодным заходнім уплывам асобныя выпадкі, надзвычайныя здарэнні, з якімі трэба змагацца з дапамогай адміністрацыйных мер. Адно з найбольш скандальных здарэнняў падобнага кшталту адбылося ў 1962 г. у 10-м класе сталічнай школы № 47: вучні адмовіліся ад школьнай формы, строгіх прычосак, захапіліся рок-н-ролам, творчасцю Э. М. Рэмарка і асабістымі пачуццямі. На думку чыноўнікаў Міністэрства асветы БССР, вінаваты ў гэтым быў класны кіраўнік дзесяцікласнікаў настаўнік фізікі В. Б. Ліпніцкі – прыхільнік «вольных поглядаў на выхаванне, пазычыўшы на Захадзе чужыя савецкім людзям элементы маралі і ідэалогіі»[30]. Педагагічны эксперымент, які праводзіў малады настаўнік, па загаду зверху быў тэрмінова спынены пасля таго, як тры вучаніцы па чарзе прызналіся яму ў каханні.

Зніжэнне ўзросту сексуальнага дэбюту, які ўсё радзей супадаў з узростам уступлення ў шлюб, зафіксавала сацыялагічнае даследаванне 1968 г., праведзенае савецкімі вучонымі А. Г. Харчавым і С. І. Голадам. З яго вынікае, што дашлюбныя палавыя кантакты падтрымлівалі 62,0 % маладых мужчын і 55,0 % маладых жанчын. Да паўналецця палавое жыццё пачыналася ў 14,5 % дзяўчат і 52,5 % юнакоў. Ад уступлення ў інтымную сувязь дзяўчын утрымлівалі маральныя меркаванні і адсутнасць палавой цягі, хлопцаў – адсутнасць спрыяльнага выпадку [5, с. 138]. Гэта агульнасаюзная статыстыка пацвярджаецца беларускімі архіўнымі матэрыяламі. Так, вынікі праверкі рэспубліканскіх школ-інтэрнатаў, якая праводзілася ў канцы 1962 г., паказалі шматлікія дысцыплінарныя парушэнні, многія з якіх з’яўляліся насамрэч праявамі ранняй падлеткавай сексуальнасці[31].

Адным са сваіх найважнейшых дасягненняў на шляху камуністычнага будаўніцтва кіраўніцтва КПБ лічыла ўцягненне жанчыны ў сацыяльна-эканамічнае жыццё. Сапраўды, у 1963 г. у агульнай колькасці працоўных рэсурсаў БССР жанчыны складалі 55,5 %[32]. Аднак сапраўднай гендарнай роўнасці дасягнута не было. У сферы працоўнай дзейнасці адбылося не столькі выраўноўванне магчымасцей жанчын і мужчын, колькі фемінізацыя ніжэйшых узроўняў прафесійнай іерархіі. Жанчыны займалі менш прэстыжныя працоўныя месцы, якія горш аплачваліся, і значна радзей за мужчын былі прадстаўлены на вышэйшых прыступках падзелу працы. У 1950–60-я гг. сярэдні заробак беларускіх жанчын, сярод якіх 36,0 % ніколі не наведвалі школу і прыкладна столькі ж мелі пачатковую і няскончаную сярэднюю адукацыю, быў амаль на трацiну ніжэй, чым у мужчын[33].

[26] *Пешко В.* Сто вопросов Амуру // Знамя юности. 1966. 30 янв. (№ 21). С. 2 ; *Мелешко А.* Клуб «Счастье» нужен // Знамя юности. 1966. 13 окт. (№ 199). С. 4.
[27] *Лось Е.* Чысціня дзявочага імені // Звязда. 1960. 18 снеж. (№ 298). С. 4.
[28] *Сердюк Л.* Праздник любви и цветов // Знамя юности. 1957. 27 авг. (№ 169). С. 3.
[29] *Гуревич Т.* О любви с 8 до 11 // Знамя юности. 1965. 18 марта (№ 54). С. 3.
[30] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 73. Спр. 233. Арк. 55–59.
[31] Там жа. Воп. 97. Спр. 141. Арк. 8.
[32] *Ткаченко В.* Ликвидация остатков бытового неравенства женщины // Коммунист Белоруссии. 1963. № 10. С. 56.
[33] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 576. Арк. 22.



А. Дзітлаў. Фотаэцюд «На прастор».
Крыніца: Беларусь. 1960. № 9. Уклейка

A. Dzitlaq. Photo study «To the vastness».
Source: Belarus. 1960. No. 9. Insert




З. Паўлоўскі. Карыкатура «У загсе».
Крыніца: Вожык. 1964. № 8. С. 6

Z. Pawlowski. Caricature «At the register office».
Source: Vozhyk. 1964. No. 8. P. 6



Лі Харві Освальд з Марынай Прусаковай
на балконе яго мінскай кватэры. 1961.
Крыніца: Life. 1964. 10 ліп. Вокладка

Lee Harvey Oswald and Marina Prusakova
on the balcony of his flat in Minsk. 1961.
Source: Life. 1964. July 10. Cover page




Ю. Іваноў. Манекеншчыцы Мінскага дома мадэляў. 1966.
Крыніца: архіў аўтара

Ju. Ivanow. Models of Minsk fashion house. 1966.
Source: author's archive

У 1966 г. супрацоўнікі сектара этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР падзяліліся з шырокай аўдыторыяй несуцяшальнымі вынікамі даследавання сямейнага побыту насельніцтва. З іх вынікала, што ў большасці сем'яў хатнія абавязкі падзяляліся на мужчынскія і жаночыя. Да ліку жаночых традыцыя адносіла найбольш працаёмкія заняткі, такія як гатаванне ежы, мыццё бялізны, мыццё падлогі, дагляд дзяцей. Працягласць працоўнага дня сярэднестатыстычнай гараджанкі, які ўключаў вытворчую і хатную работу, складала 12 гадзін. У вясковых жанчын у летні перыяд гэты паказчык дасягаў 17 гадзін. У той жа час у большасці беларускіх мужчын працягласць працоўнага дня з улікам вытворчай і хатняй работы не перавышала 9 гадзін[34].

Разам з тым вецер змен пасля XX з'езда КПСС разбураў звыклыя гендарныя стэрэатыпы маскуліннасці і фемінінасці. Адносіны мужчын і жанчын ва ўсіх сферах грамадскага і асабістага жыцця рабіліся больш дэмакратычнымі і роўнымі. Гэта давала прастору для развіцця індывідуальнасці, але разам з тым спараджала новыя сацыяльныя і псіхалагічныя праблемы і канфлікты. Некаторыя выказвалі нязгоду з другаснай, падпарадкаванай роляй жанчыны ў сексуальна-шлюбных дачыненнях[35], іншых раздражнялі праявы жаночай эмансіпацыі накшталт публічнага курэння, якое набывала характар эпідэміі[36]. Усё часцей жанчыны неслі адказнасць за сямейны бюджэт і рашэнне асноўных пытанняў хатняга жыцця. З 748 даследаваных у другой палове 1950-х гг. беларускімі этнографамі рабочых сем'яў Мінска 219 кіраваліся жанчынамі[37].

Бальшавіцкі лозунг роўнасці полаў больш не разумеўся механістычна, як аднолькавасць ва ўсім, не зважаючы нават на біялагічныя адрозненні мужчын і жанчын. Прыкметай вяртання права жанчыны на іншасць было з'яўленне жаночых саветаў, якія замянілі скасаваныя І. В. Сталіным жанаддзелы. На МАЗе адкрыўся клуб для дзяўчат, дзе абмяркоўваліся побытавыя, маральныя і медыцынскія праблемы[38], на сталічнай вул. Друкарскай адчыніў свае дзверы салон «Прыгажосць», які прапаноўваў увесь спектр касметалагічных працэдур[39], на Мінскай швейнай фабрыцы імя М. В. Фрунзе пачалася вытворчасць першых беларускіх карсетных вырабаў [6, с. 97].

Звычайныя беларускія жанчыны вучыліся насіць элегантныя гарнітуры, туфлі на шпільцы, высокія прычоскі і, канешне, карыстацца касметыкай. Гэта быў масавы пратэст супраць мяшчанскага ханжаства і ўльтыматыўнае сцвярджэнне індывідуальнага права на прыгажосць. Стаць моднымі беларускам дапамагаў не толькі заходні кінематограф, але і Мінскі дом мадэляў, першы поспех якому прынесла калекцыя мастака І. Б. Булгакавай, прадстаўленая ў 1967 г. на Міжнародным фестывалі мод у Маскве.

У выступленні на XXII з'ездзе КПСС М. С. Хрушчоў катэгарычна спыніў усе спробы працягнуць грамадскую дыскусію 1920-х гг. пра лёс сям'і пры камунізме: «Некаторыя няслушна лічаць, што значэнне сям'і пры пераходзе да камунізму нібыта змяншаецца, а потым яна зусім знікне. У рэчаіснасці пры камунізме сям'я ўмацуецца, сямейныя адносіны канчаткова ачысцяцца ад матэрыяльных разлікаў, дасягнуць высокай чысціні і трываласці»[40].

Аднак у рэальным жыцці ў сямейна-шлюбных адносінах адбываліся зусім іншыя зрухі, абумоўленыя агульнымі заканамернасцямі індывідуалізацыі грамадскага жыцця. У адрозненне ад сталінскага, патрыярхальнага па сваёй сутнасці грамадства чалавек часоў адлігі пачынаў адчуваць сябе цэнтрам уласнага жыццёвага свету. Адпаведна павялічваліся аўтаномнасць і значнасць кожнага члена сям'і. Усё больш шлюбаў былі вынікам вольнага выбару, кахання, што рабіла іх інтымнымі, але ў той жа час крохкімі. З'явілася ўстаноўка на магчымую часовасць шлюбнага саюзу, што спрыяла павелічэнню колькасці разводаў.

Паводле даных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР, у другой палове 1950-х – пачатку 1960-х гг. колькасць разводаў мела сталую тэндэнцыю да павелічэння з адначасовым змяншэннем ліку шлюбаў і нараджэнняў. З 1955 па 1965 г. агульная колькасць разводаў у рэспубліцы павялічылася з 2397 да 9734 выпадкаў (у тым ліку ў горадзе яна склала лічбу ад 2066 да 7663, у вёсцы – ад 331 да 2071). За той жа час агульная колькасць шлюбаў скарацілася з 89 832 да 70 594 выпадкаў (у тым ліку ў горадзе яна павялічылася з 31 886 да 34 854, у вёсцы скарацілася з 57 946 да 35 740) на год. Колькасць нараджэнняў на тысячу насельніцтва за тое ж дзесяцігоддзе зменшылася з 24,9 да 17,9 выпадкаў (у тым ліку ў горадзе яна знізілася з 26,6 да 19,1, у вёсцы – з 24,3 да 17,1) на год[41].

Праведзены Вярхоўным судом БССР аналіз судовай практыкі сведчыў аб тым, што прыкладна палова шлюбаразводных спраў, разгледжаных у рэспубліцы ў 1962 г., былі ўзбуджаны па прычыне легкадумнага ўступлення маладых людзей у шлюб пасля

[34]*Иванов В.* О «мужских» делах и «женских» // Знамя юности. 1966. 23 сент. (№ 185). С. 4.
[35]*Рыма Л.* Кахаць – значыць ва ўсім дагаджаць? // Чырв. змена. 1967. 12 студз. (№ 9). С. 2.
[36]*Широкий Г.* Боюсь – закурю // Знамя юности. 1961. 19 янв. (№ 15). С. 3.
[37]*Иванов В.* Кто он, капитан семейного корабля? // Знамя юности. 1966. 25 нояб. (№ 229). С. 4.
[38]*Няхай В.* Клуб дзяўчат // Маладосць. 1956. № 10. С. 8.
[39]*Мозговая Л.* Где стать красивой? // Знамя юности. 1966. 13 февр. (№ 31). С. 2.
[40]XXII съезд КПСС. Стенографический отчет. М. : Госполитиздат, 1962. Т. 1. С. 222.
[41]Население Республики Беларусь : стат. сб. / редкол.: В. И. Новоселов [и др.]. Минск : Статиздат, 2007. С. 104, 144–146.

непрацяглага знаёмства. У Магілёўскай вобласці гэты паказчык склаў 66 %. Тыповыя тлумачэнні, якія маладыя людзі давалі суддзям падчас разгляду іх спраў, былі наступнымі: «Ганчарова я не любіла, калі выходзіла замуж, спадзявалася, што прызвычаюся да яго, але не змагла»; «Мы пазнаёміліся і назаўтра пайшлі ў загс, не ведаючы адно аднаго і не любячы»; «Я сам не ведаю, чаму я пакінуў жонку, я не разумею, што ёсць каханне»[42]. Вядомы беларускі спецыяліст у галіне сямейнага права М. Р. Юркевіч з трывогай канстатаваў: «Часта дзеці не лічаць сябе абавязанымі паведамляць бацькам аб сваім уступленні ў шлюб»[43].

Падобная мадэль паводзін была уласціва не толькі гарадской моладзі. На працягу 1950–60-х гг. у беларускай вёсцы статус галавы сям'і рабіўся ўсё больш фармальным. Змянялася стаўленне да пасагу, пазашлюбнай нараджальнасці, незамужніх жанчын, старэйшых за 25 гадоў [7, с. 401–405]. Рэцыдывы патрыярхальнасці, калі маладых жанілі супраць іх волі па дамоўленасці бацькоў, выносіліся на публічнае асуджэнне. У 1965 г. карэспандэнт газеты «Чырвоная змена» паведаміў пра жыхарку Веткаўскага раёна, якая са згоды дырэктара школы выдала замуж 16-гадовую дачку за мясцовага кінамеханіка. Праз некалькі тыдняў пасля вяселля жонка-школьніца, якую рэгулярна збіваў п'яніца муж, апынулася ў Гомельскім дзіцячым прыёмніку[44]. Загсы, падпарадкаванне якіх у 1957 г. перайшло ад Міністэрства ўнутраных спраў да выканкамаў мясцовых саветаў, рэгістравалі падобныя прымусовыя «шлюбы» з непаўналетнімі ў в. Цітава Пухавіцкага раёна[45] і некаторых іншых мясцовасцях.

Пасля з'яўлення 10 снежня 1965 г. Указа Вярхоўнага Савета СССР «Аб некаторых зменах парадку разгляду ў судах спраў аб скасаванні шлюбу», які спрашчаў судовую працэдуру разводу і адмяняў патрабаванне змяшчаць абвесткі пра яго ў газетах, паступленне падобных спраў у суды БССР павялічылася амаль удвая. У 1966 г. у 52 % выпадкаў ініцыятарамі разводу з прычыны пераважна п'янства і здрады з'яўляліся жанчыны[46].

Сямейную структуру насельніцтва моцна дэстабілізавала вайна. Нечуваныя страты мужчынскага насельніцтва пазбавілі многіх жанчын шлюбных партнёраў, што прывяло да значнага павелічэння колькасці ўдоў і жанчын, якія ніколі не знаходзіліся ў шлюбе. На 1 студзеня 1959 г. у БССР пражывалі 4 473 608 асоб жаночага і 3 587 040 асоб мужчынскага полу, з іх у шлюбе знаходзіліся 1 650 409 жанчын і 1 592 685 мужчын[47].

Падобны дысбаланс нарадзіў тып мужчыны, схільнага да шлюбных здрад і сексуальных прыгод без абавязацельстваў. Да вольнага ладу жыцця падштурхоўвала скасаванне ў 1954–1957 гг. 6-працэнтнага падатку на халасцякоў, уведзенага ў часы вайны. У 1960-я гг. палігамныя мужчыны зрабіліся аб'ектам сталай крытыкі на старонках СМІ. Часопіс «Работніца і сялянка» рэгулярна друкаваў фотаздымкі, імёны і адрасы збеглых неплацельшчыкаў аліментаў. Часопіс «Вожык» высмейваў жонак, спрабаваўшых спагнаць аліменты з законнага мужа, які ўтрымліваў некалькі каханак. Сацыяльна небяспечную з'яву заўважыла беларуская літаратура. У 1960 г. П. У. Броўка напісаў сатырычны верш, які пачынаўся папярэджваннем для ўсіх жанчын: *Скажу вам быль, не плётку, / Пра жоха аднаго, / Дзяўчаты і маладкі, / Пабойцеся яго*[48].

Яшчэ адным фактарам змянення адносін да шлюбу быў недахоп жылплошчы ў гарадах, перш за ўсё ў Мінску. Ва ўмовах, калі разлічваць на ўласную кватэру маглі толькі сем'і, пашырыліся выпадкі заключэння шлюбаў дзеля кватэры, а таксама нараджэнне дзяцей у мэтах павелічэння жылплошчы. Акрамя таго, шлюб па разліку, які афіцыйна асуджалі, даваў магчымасць атрымаць сталічную прапіску, пазбегнуць размеркавання пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы, атрымаць маёмасць мужа ці жонкі пасля іх смерці і нават з'ехаць за мяжу [8, с. 129]. Пра пашырэнне гэтай негатыўнай з'явы ўскосна сведчыла прэм'ера оперы Ю. В. Семянякі «Калючая ружа» ў 1960 г., пафас якой быў накіраваны супраць шлюбаў па разліку[49].

Змены ў сямейна-шлюбных адносінах у гэты час суправаджаліся выбухам нараджальнасці, пік якой прыпаў на 1958 г., калі ў БССР нарадзіліся 207 745 дзяцей[50] (для параўнання: у 2019 г. з'явіліся на свет 87 602 дзіцяці). З'ява, вядомая ў свеце як бэбі-бум, выклікала не толькі аптымізм, але і праблемы. Чэргі ў дзіцячыя садкі рэспублікі ўвесь час павялічваліся, дасягнуўшы ў 1965 г. лічбы ў 105 тыс. дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў[51].

[42] *Хвостов А.* Трагедии по легкомыслию // Знамя юности. 1962. 6 июня (№ 112). С. 2.
[43] *Юркевіч Н.* Зойдзем у загс // ЛіМ. 1957. 9 студз. (№ 3). С. 4.
[44] *Альгерчык У.* Вяселле па прымусу // Чырв. змена. 1965. 6 лют. (№ 25). С. 2.
[45] *Кац І.* Сябры адвялі біду // Чырв. змена. 1965. 16 лют. (№ 32). С. 3.
[46] *Юркевич Н. Г.* Брак и его правовое регулирование в СССР (по материалам Белорусской ССР) : автореф. дис. … д-ра юрид. наук : 12.00.00. М., 1967. 45 с.
[47] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 62. Спр. 576. Арк. 4.
[48] *Броўка П.* Раённы кавалер // Вожык. 1960. № 3. С. 4.
[49] *Жураўлёў Д.* Яркія фарбы «Калючай ружы» // Звязда. 1960. 30 ліст. (№ 281). С. 4.
[50] Численность, состав и движение населения Белорусской ССР / ЦСУ при Совете Министров БССР. Минск : [б. и.], 1966. С. 49.
[51] НАРБ. Ф. 4п. Воп. 73. Спр. 266. Арк. 307.

Пасля з'яўлення ў кастрычніку 1968 г. дакумента «Асновы заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб шлюбе і сям'і» распачалася актыўная праца па падрыхтоўцы другога па ліку беларускага сямейна-шлюбнага кодэкса. Беларускім заканадаўцам было дазволена крыху развіць і дапоўніць некаторыя фармулёўкі дакумента, захаваўшы яго сутнасныя палажэнні. У выніку з'явіўся Кодэкс аб шлюбе і сям'і БССР, ухвалены на сесіі Вярхоўнага Савета БССР 13 чэрвеня 1969 г. Новы кодэкс яшчэ больш спрасціў працэдуру скасавання шлюбу, якая пры ўзаемнай згодзе зацікаўленых бакоў і адсутнасці непаўналетніх дзяцей адбывалася ў загсе. Ад шматлікіх ранейшых правіл, якія рэгламентавалі дзейнасць суда па скасаванні шлюбу, засталіся толькі два: суд прымае меры да прымірэння мужа і жонкі; шлюб скасоўваецца, калі судом будзе ўстаноўлена, што далейшае сумеснае жыццё мужа і жонкі і захаванне сям'і сталі немагчымымі[52]. Разлука была немагчымай толькі падчас цяжарнасці жонкі і на працягу аднаго года пасля нараджэння дзіцяці. У выпадку нараджэння дзіцяці ў бацькоў, якія не знаходзіліся ў шлюбе, бацькоўства высвятлялася ў судзе, які ўлічваў сумеснае пражыванне, вядзенне агульнай гаспадаркі і выхаванне дзіцяці[53].

Такім чынам, новы шлюбны кодэкс 1969 г. зафіксаваў адыход ад сталінскай мадэлі сямейна-шлюбных адносін у бок сучаснай, больш дэмакратычнай сямейнай палітыкі. Яе стваральнікі не ставілі мэту дасягнуць сексуальнага разняволення асобы, а імкнуліся змякчыць дзяржаўны кантроль над ёй. Тым не менш пры ўсіх абмежаваннях прызнанне ў афіцыйным дыскурсе эпохі адлігі наяўнасці полу і сексуальнасці паспрыяла мадэрнізацыі беларускага грамадства ў цэлым.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Лебина НБ. *Мужчина и женщина: тело, мода, культура. СССР – оттепель*. Москва: Новое литературное обозрение; 2014. 203 с.
2. Фуко М. *Воля к истине: по ту сторону знания, власти и сексуальности. Работы разных лет*. Москва: Касталь; 1996. 448 с.
3. Нойберт Р. *Вопросы пола*. Москва: Медгиз; 1960. 87 с.
4. Лаптенок С. *Мораль и семья*. Минск: Наука и техника; 1967. 244 с.
5. Харчев АГ, Голод СИ. Молодежь и брак. В: Ананьев БГ, Дмитриев АВ, Керимов ДА, Кузьмин ЕС, Орехов ВВ, Полозов ВР, редакторы. *Человек и общество. Ученые записки. Выпуск 6. Социальные проблемы молодежи*. Ленинград: Издательство Ленинградского университета; 1969. с. 125–142.
6. Бембель Т, составитель. *Milavitsa. 100 лет истории: 1908–2008*. Минск: Полипринт; 2008. 219 с.
7. Лавриновская ИВ. Традиции и новации в брачно-семейных установках сельской женщины в Беларуси в XX – начале XXI в. *Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі*. 2011;11:399–407.
8. Юркевич Н. *Заключение брака по советскому праву*. Минск: Наука и техника; 1965. 141 с.

## References

1. Lebina NB. *Muzhchina i zhenshchina: telo, moda, kul'tura. SSSR – ottepel'* [Man and woman: body, fashion, culture. The USSR is a thaw]. Moscow: Novoe literaturnoe obozrenie; 2014. 203 p. Russian.
2. Fuko M. *Volya k istine: po tu storonu znaniya, vlasti i seksual'nosti. Raboty raznykh let* [The will to truth: beyond knowledge, power, and sexuality. Works of different years]. Moscow: Kastal'; 1996. 448 p. Russian.
3. Neubert R. *Die Geschlechterfrage.* Rudolstadt: Greifenverlag; 1956. 199 S.
Russian edition: Neubert R. *Voprosy pola.* Moscow: Medgiz; 1960. 87 p.
4. Laptenok S. *Moral' i sem'ya* [Morality and family]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1967. 244 p. Russian.
5. Kharchev AG, Golod SI. [Youth and marriage]. In: Anan'ev BG, Dmitriev AV, Kerimov DA, Kuz'min ES, Orekhov VV, Polozov VR, editors. *Chelovek i obshchestvo. Uchenye zapiski. Vypusk 6. Sotsial'nye problemy molodezhi* [Man and society. Scientific notes. Issue 6. Social problems of youth]. Leningrad: Izdatel'stvo Leningradskogo universiteta; 1969. p. 125–142. Russian.
6. Bembel' T, compiler. *Milavitsa. 100 let istorii: 1908–2008* [Milavitsa. 100 years of history]. Minsk: Poliprint; 2008. 219 p. Russian.
7. Lavrinovskaya IV. [Traditions and innovations in the marital and family attitudes of rural women in Belarus in the 20$^{th}$ – early 21$^{st}$ century]. *Pytanni mastactvaznawstva, jetnalogii i fal'klarystyki.* 2011;11:399–407. Russian.
8. Yurkevich N. *Zaklyuchenie braka po sovetskomu pravu* [Marriage under Soviet law]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1965. 141 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 18.01.2022.*
*Received by editorial board 18.01.2022.*

[52] Кодэкс аб шлюбе і сям'і Беларускай ССР // Збор законаў, указаў Прэзідыума Вярхоўн. Савета Беларус. ССР, пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў Беларус. ССР. 1969. 14 чэрв. (№ 17). С. 374.
[53] Там жа. С. 378.